УДК 272/273 “1569/1795”(438)

# КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ У БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

**Саракавік Іван Аляксандравіч, Булай Арыянна Сяргееўна**
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (г. Мінск, Беларусь)

*У прадстаўленым матэрыяле разглядаецца асаблівае становішча Каталіцкага Касцёла на тэрыторыі Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай. Паказана, што яго падтрымка ўладай прывяла да абвастрэння канфесійнага становішча на беларускіх землях.*

У выніку Контррэфармацыі каталіцкае веравызнанне засталося дзяржаўнай рэлігіяй. На яго падтрыманне была накіравана сіла дзяржаўнай улады. Менавіта каталіцкія біскупы займалі вядучае месца ў Сенаце. Кіраўнікі дзяржавы выступалі ярымі прыхільнікамі каталіцтва і гэта стварала спрыяльныя ўмовы для дзейнасці гэтай канфесіі. У гэты перыяд каталіцкія парафіі з’явіліся і на ўсходзе Беларусі. За кароткі час у яе шарэнгі пад уплывам дзейнасці найперш езуітаў перайшло шмат вернікаў іншых канфесій. Менавіта Каталіцкі Касцёл зацікаўлена падтрымліваў і праводзіў рэлігійную унію ў Беларусі і Украіне.

З мэтай пашырэння ўплыву на вернікаў іншых канфесій ордэн езуітаў сваёй дзейнасцю размываў этнічную самасвядомасць беларусаў, адрываў ад гістарычнай і духоўнай спадчыны продкаў. Дзеля гэтага выдавалася літаратура на лацінскай і польскай мовах, а беларускую яны выкарыстоўвалі для выкладання ў малодшых класах калегіумаў. Беларуская мова ў дадзеным выпадку служыла тым пернікам праз які беларускія дзеці прыцягваліся да каталіцтва. Аднак у сваёй дзейнасці яны не цураліся і больш ганебных сродкаў: пагромаў, здзекаў, шантажу, забойстваў. Ва ўсе органы ўлады і кіравання яны імкнуліся «ставіць» сваіх людзей. Але тут яны не заўсёды знаходзілі падтрымку ва ўрадаўцаў Княства, хаця большая частка магнатаў і шляхты, па сутнасці здрадзіўшы свайму народу, прыняла каталіцкую веру.

Л. І. Сапега, канцлер ВКЛ і віленскі ваявода, клапаціўся, каб Касцёл ў Беларусі быў беларускім, а не польскім. І таму на вакантныя пасады падтрымліваў мясцовых святароў. Калі ў 1590 г. памёр кракаўскі біскуп, то на яго месца кароль хацеў прызначыць віленскага біскупа кардынала Ю. Радзівіла, але Сапега параіў яму не пагадзіцца на гэту прапанову. І Ю. Радзівіл заняў кафедру у Кракаве. Кароль пажадаў прызначыць на пасаду віленскага біскупа паляка Б. Мацееўскага. Аднак Сапега прыклаў усе свае камаганні для таго, каб ён не стаў ім. І свайго дабіўся.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Да 1600 г. гэта кафедра не была занята [1, с. 75, 76]. Пасля доўгай зацятай барацьбы яе прыняў усё ж ліцвін Бенядыкт Война. Сапега разумеў значнасць гэтай пасады для ВКЛ, з аднаго боку, і тое, да чаго можа прывесці такая кадравая палітыка палякаў, з другога боку. Не выпадкова ён пісаў у адным са сваіх лістоў: «…тады паддайцеся ва ўсім палякам, адмоўцеся ад літоўскай пячаткі, маршальскага жазла і гетманскай булавы, і няхай будуць польскія жасы, пячаткі і булавы, ды і агульны скарб...» [2, с. 15].

Але такая пазіцыя была далёка не ва ўсіх урадаўцаў ВКЛ. Неправавыя дзеянні Касцёла ў Княстве і яе асобных ордэнаў выклікалі незадавальненне ў праваслаўных і пратэстанцкіх святароў і вернікаў. Кіраўніцтва Расіі лічыла, што на гэтай тэрыторыі павінна панаваць праваслаўная вера. Касцёлы і кляштары, друкарні і школы зачыняліся і перадаваліся, як правіла, праваслаўнай царкве. Такая палітыка царскага ўрада прадаўжалася да таго часу, пакуль не стала зразумела, што Расія не зможа ўтрымаць беларускія землі, калі не будзе лагодна ставіцца да магнатаў і шляхты, іх уласнасці і веры. І таму ў 1656 г. Аляксей Міхайлавіч выдаў указ, дазваляючы дзейнасць каталіцтва на захад ад Бярэзіны [3, с. 190].

Пасля вайны сярэдзіны XVII ст. Каталіцкі Касцёл поўнасцю аднавіў сваю структуру і парафіі на тэрыторыі Беларусі, вярнуўшы сабе сваю нерухомасць і зямельныя надзелы. Толькі ордэн езуітаў на пачатак 1770-х гг. валодаў каля 250 тыс. гектараў зямлі, больш за 11 тыс. валокаў лесу, 1119,9 тыс. рублёў серабром [4, с. 347]. У цэлым у канцы XVIII ст. католікі складалі каля 15 % жыхароў Беларусі. Іх непрымірымая пазіцыя да праваслаўных і пратэстантаў дазволіла Расіі, Прусіі і Аўстрыі скарыстаць гэта у сваіх мэтах. Расія паставіла Сойму Рэчы Паспалітай па сутнасці ўльтыматум: ураўняць у правах дысыдэнтаў (некатолікаў) з католікамі ў адпаведнасці з міждзяржаўным дагаворам 1686 г. Калі Сойм не вырашыў праблему, то Расія і Прусія паспрыялі стварэнню ў 1767 г. у Слуцку праваслаўнай, а ў Торуні – пратэстанцкай канфедэрацый з мэтай дасягнення роўнасці вернікаў розных канфесій. Пад такім ціскам Сойм Рэчы Паспалітай у 1786 г. задаволіў патрабаванні дысідэнтаў і ўраўняў іх з католікамі. Гонар апошніх не дазволіў перанесці гэтае рашэнне і яны ў Бары, ва Украіне, утварылі каталіцкую канфедэрацыю. Аднак супрацьстаяць расійскай ваеннай моцы яны не змаглі [5, с. 234, 235].

Дзейнасць Касцёла ў Беларусі ў другой палове XVIII ст. ужо не мела таго размаху і ўплыву, якія былі раней. Гэта выклікана як першым падзелам Рэчы Паспалітай і заняццем усходняй часткі Беларусі царскай Расіяй, так і ў выніку працы Адукацыйнай камісіі Рэчы Паспалітай. Асвета стала набываць свецкі, а не царкоўны (каталіцкі) характар. Больш таго, у 1773 г. булай папы Клімента XIV скасавана ўдарная сіла каталіцтва ў Беларусі – ордэн езуітаў. Яго маёмасць перададзена Адукацыйнай камісіі, якая наа базе калегіумаў стварала свецкія школы.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай ад 3 мая 1791 г. замацавала каталіцкую веру пануючай рэлігіяй у дзяржаве. У той жа час для іншых канфесій гарантавалася свабода выканання рэлігійных абрадаў. Гэтым нарматыўным прававым актам была надзея прагрэсіўных сіл дзяржавы зберагчы яе ад канчатковага захопу Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. Аднак гэтыя надзеі не спраўдзіліся.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У разглядаемы перыяд Каталіцкі Касцёл ў Беларусі меў спрыяльныя ўмовы і пастараўся іх выкарыстаць. Для ўмацавання сваіх пазіцый ён развярнуў буйнае будаўніцтва касцёлаў, манастыроў, стварыў шырокую сетку навучальных устаноў. На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў 1744 г. дзейнічала 270 касцёлаў Віленскай дыяцэзіі [6, с. 101, 102]. Напрыканцы XIX ст. у гэтай дыяцэзіі мелася ўжо 694 касцёлы, а ў Магілеўскай архідыяцэзіі – 514. У Горадні пачатку XVII ст. на тры тысячы жыхароў мелася 8 каталіцкіх, 1 уніяцкі манастыроў і 9 касцёлаў [6, с. 105].

Густая сетка каталіцкіх манастыроў, касцёлаў, навучальных устаноў, рэлігійная літаратура – усё гэта істотна ўплывала на вернікаў. Асноўная частка каталіцкага веравызнання ў Беларусі склала прыкладна 430-440 тыс. чалавек і была сканцэнтравана на заходне-паўночным абшары беларускіх зямель. Менавіта на гэтых землях, што складалі прыкладна 25 % тэрыторыі сучаснай Беларусі, мелася амаль 70 % парафій і каля 85 % усіх католікаў [7, с. 181]. Наймені за ўсё каталіцкіх парафій знаходзілася на поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі.

Такім чынам, з-за Контррэфармацыі, Каталіцкі Касцёл пры актыўнай падтрымцы дзяржавы вярнуў, па сутнасці, сваё пануючае становішча ў краіне. Аднак з-за недальнабачнай канфесійнай палітыкі ўлады ўскладніў рэлігійнае палажэнне ў Рэчы Паспалітай, выклікаў незадавальненне вернікаў іншых канфесій. Гэта стала адной з прычын падзелаў Рэчы Паспалітай.

## Літаратура


1. Шкялёнак, М. Леў Сапега / М. Шкялёнак // Спадчына. – 1991. – № 1. – С. 58–78.
2. Лойка, П. Незалежнасць пасля Любліна, або магнацка-шляхецкая «беларусізацыя» / П. Лойка // Спадчына.– 1991. – № 5. С. 11–16.
3. Беларусазнаўства : навуч. дапаможнік. – Мінск : Завічар, 1997. – 284 с.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 3. Гімназіі – Кадэнцыя / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996. – 527 с.
5. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1 / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.
6. Мараш, Я. Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795) / Я. Н. Мараш. – Минск : Вышэйшая школа, 1971. – 272 с.
7. Туронак, Ю. Фармаванне сеткі рыма-каталіцкіх парафіяў у Беларусі (1387–1781) / Ю. Туронак // Беларускі гістарычны агляд. – Мінск, снежань, 1995. Т. 2, Сшытак 2. – С. 179–183.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова